www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

7 снежня 2006 года, № 20 (1950)

ВІНШУЕМ!

ЛАЎРЭАТЫ ПРЭЗІДЭНЦКАГА ФОНДУ

Урачыстае ўзнагароджанне прэміямі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў адбылося 27 лістапада. Іх атрымалі лаўрэаты і прызёры Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых прац 2005 года.

Лаўрэатамі сталі 8 студэнтаў БДУ: Аляксей Вайніловіч, Дзяніс Мітрафанаў, Вадзім Гудзель, Кірыл Кузьмін, Дзмітрый Хмяльніцкі, Сяргей Дзямідчык, Маргарыта Фабрыкант і Аляксандр Шашко. Ім былі выдадзены пасведчанні фонду за подпісам кіраўніка дзяржавы і грашовыя прэміі. Акрамя таго, грашовымі прэміямі былі адзначаны яшчэ 32 студэнты нашага універсітэта, а таксама старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу Ірына Грыбко, намесніца дэкана факультэта міжнародных адносін Алена Дастанка, загадчык кафедры філасофіі культуры Анатоль Лягчылін, намеснік дэкана юрыдычнага факультэта Уладзімір Сатолін. Педагогі атрымалі ўзнагароды за навуковае кіраўніцтва сваіх выхаванцаў, якія прымалі ўдзел у Рэспубліканскім конкурсе для студэнтаў гуманітарных факультэтаў "Беларусь у сучасным свеце" і вялікі асабісты ўнёсак у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі.

З гэтай нагоды прысутных павіншавалі міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Васіль Стражаў і старшыня фонду Алена Бялова.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ
Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА

ВЕДАЙ НАШЫХ!

МЫ Ў ФІНАЛЕ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ!

Каманда Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў складзе студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Паўла Іржаўскага (III курс), Уладзіміра Керуса (II курс), Мікіты Леснікава (I курс) выйграла паўфінальны турнір каманднага чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнцкіх камандаў у рамках Паўночна-Усходняга рэгіёна і заваявала права ўдзельнічаць у фінальных спаборніцтвах, якія адбудуцца ў Токіо ў сакавіку 2007 года.

Адборачныя спаборніцтвы прайшлі 29 лістапада на базе Санкт-Пецярбургскага універсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі. У іх прынялі ўдзел 192 студэнцкія каманды з ВНУ Расіі, Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Казахстана, Грузіі, Арменіі, Узбекістана, Кіргізіі, Турцыі, якія заваявалі гэтае права сваімі выступамі на чвэрцьфінале ў Мінску. Ад Беларусі ўдзельнічалі тры каманды БДУ і па адной — ад БДУІР і Беларуска-расійскага універсітэта. Студэнты змагаліся за месца сярод 12 найлепшых камандаў, прычым у наступны этап праходзіў толькі адзін калектыў ад адной ВНУ.

У Японіі нашы студэнты будуць весці барацьбу за залатыя медалі ў ліку 85 найлепшых універсітэцкіх камандаў свету.

Паводле і нфармацыі прэс-службы БДУ
Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА

РЭХА ПАДЗЕЙ

ПАДЗЯКА ЗА "КУФАР"

Фестываль "Тэатральны куфар—2006" выклікаў шмат станоўчых водгукаў. Адзін з іх прыйшоў з амерыканскага універсітэта Буфала ад прафесара Марыі С. Хорн — установчага дырэктара Міжнароднай праграмы мастацкага і культурнага абмену IACE і віцэ-прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі універсітэцкіх тэатраў AITU. У лісце гаворыцца, што гэтае мерапрыемства стала адметным міжнародным аглядам выдатных артыстычных талентаў універсітэтаў, тэатральных калектываў, вядомых тэатральных педагогаў, выканаўцаў, мастакоў, рэжысёраў і драматургаў: "Удзел дэлегацый з Беларусі, Бельгіі, Чэхіі, Фінляндыі, Ірана, Германіі, Грэцыі, Літвы, Румыніі, Расіі, Славеніі, Швецыі, Швейцарыі, Вялікабрытаніі і ЗША даў цудоўную магчымасць для абмену мастацкім досведам і культурнага паразумення на міжнародным узроўні". Спадарыня Марыя С. Хорн падзякавала рэктару БДУ прафесару Васілю Стражаву, а таксама начальніку ўпраўлення па справах культуры Уладзіміру Макарэвічу, Сяргею Турбану і Кацярыне Саладусе за неацэнную працу. Акрамя таго, яна запрасіла прадстаўніка Белдзяржуніверсітэта наведаць універсітэт Буфала для развіцця стасункаў паміж навучальнымі ўстановамі.

Сяргей ШАФАЛОВІЧ

ПАДЗЕІ

ЗНАЁМСТВА З КІТАЕМ

30 лістапада адбылася прэзентацыя кнігі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Балгарыя ў Беларусі Петкі Ганчава "Возрождающийся гигант", прысвечанай даследаванням духоўнай культуры, філасофіі і цывілізацыі Кітая.

Імпрэза прайшла ў будынку рэктарата, у зале паседжанняў Вучонага савета. На ёй прысутнічаў рэктар нашага універсітэта прафесар Васіль Стражаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі У Хуньбінь, а таксама прадстаўнікі іншых дыпламатычных місій і Міністэрства замежных спраў Беларусі, студэнты і выкладчыкі БДУ. Кніга памерам амаль у чатыры сотні старонак была надрукавана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Яна змяшчае глыбокі аналіз уплыву тысячагадовай культурнай традыцыі на розныя сферы жыцця сучаснага кітайскага грамадства.

Кніга адрасуецца студэнтам, спецыялістам-кітаязнаўцам, палітыкам, дзеячам навукі і культуры.

Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

«МЫ РАЗЛІЧВАЕМ НА СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ...»

Інтэрв'ю з намеснікам дырэктара Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі і адукацыі Л.І.Шумскай

Стар. 2

45 ГАДОЎ НА СКРЫЖАВАННІ КУЛЬТУР

Факультэт дауніверсітэцкай адукацыі адзначае знамянальную дату

Стар. 3

ЛЕПШЫ МАЛАДЗЁЖНЫ ПРАЕКТ

Інтэрв'ю з намеснікам начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Аляксеем Багамазавым

Стар. 4

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў прыняў удзел у святкаванні 15-годдзя Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага універсітэта, якое адбылося ў Маскве, а таксама 10-годдзя Мінскай Духоўнай Акадэміі імя Кірылы Тураўскага ў Жыровічах.

Падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве БДУ з Карэйскім палітэхнічным універсітэтам і правядзенне семінара-прэзентацыі Белдзяржуніверсітэта з удзелам прадстаўнікоў вядучых НДІ і ВНУ Карэі – асноўная мэта візіту ў гэту краіну з 6 па 10 снежня рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава.

Сумесная калегія Міністэрстваў адукацыі Беларусі і Расіі, а таксама Дзяржаўнага камітэту па навуцы і тэхналогіях нашай краіны адбылася 5 снежня ў БДУ.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ

7 снежня 2006 года, № 20 (1950)

УСТАНОВЫ

Л.І. ШУМСКАЯ:

“МЫ РАЗЛІЧВАЕМ НА СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ...”

БДУ — гэта не толькі шматлікія факультэты і шэраг адукацыйных устаноў, але і вельмі разгалінаваная структура розных даследчых цэнтраў і інстытутаў. Асаблівае месца сярод іх займае створаны 20 ліпеня 2005 г. Інстытут сістэмных даследаванняў праблем моладзі і адукацыі (ІСДПМА). У чым спецыфіка гэтай маладой установы? Які спектр яе дзейнасці? Што цікавага і карыснага робіцца ў яе сценах? Пра гэта распавяла доктар псіхалагічных навук Любоў Іванаўна Шумская, намеснік дырэктара Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі і адукацыі, дырэктар Цэнтра псіхалагічных даследаванняў.

— З якой мэтай быў створаны ІСДПМА?

— Ініцыятарам гэтага выступіў рэктар БДУ Васіль Іванавіч Стражаў, які ўсклаў на сябе абавязкі кіраўніка інстытута. Асноўнай задачай было аб’яднаць намаганні існуючых ва універсітэце навукова-даследчых структур, якія займаюцца распрацоўкамі праблем моладзі і грамадства ўвогуле, а таксама пытаннямі ўдасканалення сістэмы вышэйшай адукацыі. Так вызначылася і асноўная мэта дзейнасці нашага інстытута — рэалізацыя сістэмных навуковых даследаванняў, накіраваных на раскрыццё ролі моладзі ў інавацыйным развіцці беларускага грамадства і ўкараненне атрыманых навуковых вынікаў у адукацыйную практыку. Хачу асабліва падкрэсліць, што нашы галоўныя намаганні скіраваны на даследаванне праблем студэнцкай моладзі, што дазваляе інстытуту займаць цалкам самастойную нішу і прыярытэтную пазіцыю ў вырашэнні шэрага задач, якія ставіць кіраўніцтва дзяржавы перад вышэйшай школай Рэспублікі Беларусь.

— Якая зараз структура інстытута?

— Першапачаткова ён складаўся шляхам асацыятыўнага аб’яднання такіх ужо досыць сталых і вядомых структурных падраздзяленняў БДУ, як Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў (ЦСПД), які ўзначальвае прафесар Д.Г. Ротман, Цэнтр праблем развіцця адукацыі (ЦПРА) пад кіраўніцтвам дацэнта М.А. Гусакоўскага і Цэнтр міжнародных даследаванняў (ЦМД) на чале з кандыдатам палітычных навук У.Я. Улаховічам. На працягу гэтага года ў структуры інстытута створаны два новыя цэнтры: Цэнтр псіхалагічных даследаванняў (ЦПД) пад маім кіраўніцтвам і Вучэбны цэнтр дадатковай адукацыі (ВЦДА), які ўзначаліла З.І. Несцяровіч. Агульная колькасць супрацоўнікаў налічвае зараз 55 чалавек.

Трэба адзначыць, што ІСДПМА — гэта ўстанова новага пакалення. Яна больш падобная да сучаснага мініхолдынгу, які пры дастатковай ступені самастойнасці асобных цэнтраў скіраваны на атрыманне больш якаснага эфекту ад сумесных навуковых распрацовак.

— Якія праграмы ўвогуле ажыццяўляюцца вашымі цэнтрамі?

— Яны арганізуюць вельмі важныя і цікавыя даследаванні. Надзвычай складана вылучыць нешта больш ці менш значнае. Напрыклад, ЦСПД рэалізуе міжнародныя праграмы INTAS “Сацыяльныя і палітычныя трансфармацыі ў краінах СНД: ключавыя індыкатары”, “Мадэлі міграцыі на новых еўрапейскіх межах”, “Тэндэнцыі развіцця рэгіянальнага рынку працы”, некалькі праграм Рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. Вялікую зацікаўленасць у агульнабеларускім і міжнародным маштабе выклікае даследаванне “Расійскія суайчыннікі ў краінах былога СССР”.

Вельмі перспектыўны кірунак ЦПРА звязаны з абагульненнем і распаўсюджваннем інавацыйнага вопыту выкладання. Ажыццяўляючы навукова-метадычную падтрымку выкладчыцкай супольнасці ва ўмовах адаптацыі вучэбных курсаў да новых адукацыйных тэхналогій, супрацоўнікі Цэнтра рыхтуюць аналітычныя агляды, распрацоўваюць рэкамендацыі, перакладаюць сучасныя замежныя дыдактычныя матэрыялы. Канкрэтныя спосабы арганізацыі навучальнай дзейнасці апрабоўваюцца ў рамках праекта “Інтэрактыўная педагогіка”, які ўключае штогадовую серыю семінараў-майстэрняў для выкладчыкаў БДУ, традыцыйныя навукова-практычныя канферэнцыі і падрыхтоўку метадычных дапаможнікаў.

Цэнтр міжнародных даследаванняў, у сваю чаргу, працуе па некалькіх тэмах Дзяржаўнай праграмы інфармацыйнага забеспячэння знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці. У гэтым годзе ён прымаў удзел у распрацоўцы ініцыятыў нашай краіны ў ААН, пачаў выдаваць электронны штоквартальны веснік “Экспертыза”.

— Зразумела, што асноўны кірунак вашай дзейнасці — даследаванні. А ці займаецеся вы ўвасабленнем сваіх навуковых ідэй і распрацовак у жыццё?

— Менавіта дзеля гэтай мэты і быў створаны Вучэбны цэнтр дадатковай адукацыі. Тыя інавацыйныя распрацоўкі, якія ажыццяўляюцца ў нашых цэнтрах, рэалізуюцца пры дапамозе адукацыйных паслуг ВЦДА.

Напрыклад, адна з яго прыярытэтных задач — у межах інавацыйна-адукацыйнага праекта “Новае пакаленне лідэраў” падрыхтаваць запатрабаванага часам чалавека — кампетэнтнага, актыўнага і самастойнага, дэвізам якога будуць выступаць словы “чалавек, які зрабіў сябе сам”. З пачатку верасня ў рамках гэтага праекта ўжо вядуцца вучэбныя заняткі ў Школе прадпрымальніцтва для моладзі па двух курсах — “Асновы менеджменту і прадпрымальніцтва” для вучняў старэйшых класаў і “Уласная справа” для студэнтаў і маладых спецыялістаў.

— Якія яшчэ праекты нарадзіліся ў сценах вашага інстытута?

— Па лініі Цэнтра псіхалагічных даследаванняў мы прынялі непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы дзяржаўнага праекта — адноўленай Канцэпцыі выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. Шмат намаганняў прыклалі члены існуючага на базе ЦПД часовага навуковага калектыву “Выхавацель” для распрацоўкі тэхналогій вымярэння эфектыўнасці і якасці выхаваўчага працэсу ў вышэйшай школе. Зараз пад маім кіраўніцтвам мы заканчваем працу над метадычным дапаможнікам па гэтай тэматыцы, які імкнемся зрабіць навукова абгрунтаваным і карысным для іншых ВНУ. Пасля выдання дапаможніка сумеснымі намаганнямі ЦПД і Вучэбнага цэнтра дадатковай адукацыі будзе распачата серыя прыкладных семінараў па яго ўкараненні ў практычную дзейнасць выхаваўчых структур ВНУ.

Цэнтр міжнародных даследаванняў пачынае рэалізацыю сумеснага праекта з Міністэрствам замежных спраў — “Стратэгіі культурнай прысутнасці Беларусі ў свеце”. У ім закладаецца канцэпцыя нашай культурнай палітыкі, якая ўрэшце вядзе да ўмацавання эканамічных сувязяў.

Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў па заданні Дзяржаўнага камітэту па навуцы і тэхналогіях займаецца вывучэннем ролі сродкаў масавай інфармацыі ў фарміраванні пазітыўнага іміджу Беларусі за мяжой. Таксама ЦСПД па ўзгадненні з Міністэрствам інфармацыі бярэцца за распрацоўку праблемы стварэння адзінай інфармацыйнай прасторы Беларусі і Расіі.

Такім чынам, кожны цэнтр мае свае профільныя навуковыя планы, але мы таксама пачынаем развіваць і агульныя інстытуцкія даследаванні з удзелам часовых навуковых калектываў, у якіх аб’яднаюць намаганні прадстаўнікі ўсіх цэнтраў. Мы разлічваем, што тут будзе спрацоўваць так званы сінергетычны эфект, бо кожная з гэтых тэмаў патрабуе ўдзелу даследчыкаў з розных галін ведаў, і якраз гэта забяспечыць якасныя вынікі нашай працы. З гэтага года сумеснымі намаганнямі нашых цэнтраў ІСДПМА ўдзельнічае ў выкананні Дзяржаўнай комплекснай навуковай праграмы даследаванняў “Эканоміка і грамадства” пад кіраўніцтвам Нацыянальнай акадэміі навук. Гэта сур’ёзная пяцігадовая праца, якая тычыцца месца моладзі ў сучасных эканамічных адносінах.

— А ці плануеце вы супрацоўнічаць з іншымі ВНУ краіны?

— У нас ёсць задума сумесна з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам, Расійскім дзяржаўным сацыяльным універсітэтам і Навукова-даследчым інстытутам комплексных сацыяльных даследаванняў Санкт-Пецярбургскага універсітэта правесці падрыхтоўку кадраў названай ВНУ. Гэта вельмі важная і актуальная праблема, ад вырашэння якой у значнай меры залежыць не толькі якасць адукацыі будучых спецыялістаў, але і іх грамадская свядомасць, актыўная жыццёвая пазіцыя, а таксама падрыхтоўка маладой навуковай змены.

— Зараз мы рыхтуем пагадненне аб узаемадзеянні з самай маладой вышэйшай навучальнай установай Беларусі — Палескім дзяржаўным універсітэтам. Яго рэктар прафесар К.К. Шабека вельмі зацікаўлены ў нашай дапамозе па ўдасканальванні прафесійна-педагагічнай дзейнасці выкладчыкаў, у арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў.

— Што б Вы маглі сказаць адносна бліжэйшых планаў інстытута?

— Пачаў сваю дзейнасць у жніўні 2006 г.

Цэнтр працуе ў сферы карпаратыўнага навучання: у ім рэалізуюцца праграмы “Дзелавая замежная мова” і “Менеджмент у сацыяльнай сферы”. Таксама ён прапануе адукацыйныя праграмы па паглыбленні прафесійнай і сацыяльнай кампетэнцыі моладзі: ладзіць падрыхтоўчыя курсы ў малакамплектных групах для падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і інш. У 2006/2007 навучальным годзе ВЦДА ажыццяўляе інавацыйны праект “Новае пакаленне лідэраў”, у межах якога дзейнічае “Школа прадпрымальніцтва для моладзі”, якая складаецца з двух навучальных курсаў — “Асновы менеджменту і прадпрымальніцтва” для старшакласнікаў і “Уласная справа” для студэнтаў і маладых спецыялістаў.

Цэнтр псіхалагічных даследаванняў створаны ў чэрвені 2006 г. Галоўным напрамкам дзейнасці цэнтра выступае даследаванне выхаваўчых аспектаў праблем сацыялізацыі навучэнцаў і студэнтаў. У цэнтры ўвагі спецыялістаў — маніторынг сэнсажыццёвых арыентацый студэнцкай моладзі, выяўленне псіхалагічных асаблівасцяў сацыялізуючага ўплыву інстытуцыянальнага і нефармальнага асяроддзяў, асобы і дзейнасці выкладчыка ВНУ на грамадзянскае і прафесійнае стаўленне студэнтаў.

Вучэбны цэнтр дадатковай адукацыі

Пачаў сваю дзейнасць у жніўні 2006 г.

Цэнтр працуе ў сферы карпаратыўнага навучання: у ім рэалізуюцца праграмы “Дзелавая замежная мова” і “Менеджмент у сацыяльнай сферы”. Таксама ён прапануе адукацыйныя праграмы па паглыбленні прафесійнай і сацыяльнай кампетэнцыі моладзі: ладзіць падрыхтоўчыя курсы ў малакамплектных групах для падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і інш. У 2006/2007 навучальным годзе ВЦДА ажыццяўляе інавацыйны праект “Новае пакаленне лідэраў”, у межах якога дзейнічае “Школа прадпрымальніцтва для моладзі”, якая складаецца з двух навучальных курсаў — “Асновы менеджменту і прадпрымальніцтва” для старшакласнікаў і “Уласная справа” для студэнтаў і маладых спецыялістаў.

Цэнтр праблем развіцця адукацыі

ЦПРА быў створаны ў 1997 г.

Асноўныя напрамкі яго дзейнасці: арганізацыя і правядзенне міждысцыплінарных навуковых даследаванняў у галіне тэорыі і метадалогіі універсітэцкай адукацыі; праектаванне, адаптацыя і ўкараненне ў навучальны працэс новых адукацыйных тэхналогій; арганізацыя метадычных семінараў па інавацыйнай педагогіцы; экспертыза інавацыйных адукацыйных праектаў; арганізацыя эксперыментальных адукацыйных пляцовак; магістэрская падрыхтоўка спецыялістаў у галіне дыдактыкі вышэйшай школы і сацыяльнай педагогікі; майстэрні, канферэнцыі, семінары і іншыя формы павышэння кваліфікацыі для выкладчыкаў — даследчыкаў у галіне тэарэтычнай педагогікі і інавацыйнай практыкі; аналітыка актуальных тэндэнцый развіцця адукацыі.

Цэнтр міжнародных даследаванняў

ЦМД быў утвораны ў сакавіку 2000 г. з удзелам Міністэрства замежных спраў. Яго дзейнасць скіравана на ўмацаванне сувязяў акадэмічнай навукі і дзяржаўнага кіравання ў сферы знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай практыкі. Асноўныя мэты цэнтра: навукова-практычныя распрацоўкі і прагнастычныя даследаванні міжнародных адносін, сусветнай эканомікі і рэгіянальнай палітыкі; каардынацыя навукова-даследчых праектаў; арганізацыя навукова-практычных канферэнцый і семінараў; метадычная падтрымка навучальнага працэсу па профільных спецыяльнасцях. ЦМД супрацоўнічае з даследчымі структурамі Расіі, Польшчы, Украіны, Італіі і інш. Цэнтр выконваў шматлікія галіновыя навукова-даследчыя праекты на замову МЗС Беларусі, прымаў удзел у працы міжведамасных груп па падрыхтоўцы ініцыятыў Рэспублікі Беларусь у ААН, распрацоўцы заканадаўчых актаў адпаведнага профілю.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Газета “Універсітэт” папрасіла рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава расказаць аб значэнні ІСДПМА для універсітэта:

Стварэнне Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі і адукацыі мела на мэце аб’яднаць намаганні некалькіх адасобленых цэнтраў, якія працуюць, у прынцыпе, у адным кірунку. Гэта наўпрост звязана з павышэннем агульнай эфектыўнасці іх дзейнасці. Для гэтага мы знайшлі новую арганізацыйную форму, у якой іх даследчая праца стане насіць сістэмны і ўзаемнадапаўняльны характар. Цяпер ідзе нарошчванне наяўнага патэнцыялу. У 2006 г. былі створаны Цэнтр псіхалагічных даследаванняў, а таксама Вучэбны цэнтр дауніверсітэцкай адукацыі. У далейшым не выключаецца магчымасць стварэння яшчэ аднаго цэнтра альбо ўключэння асобных лабараторый. Статус інстытута дазваляе гэта рабіць у рамках агульнаўніверсітэцкай структуры. Аднак пойдзем на гэта толькі тады, калі будзе адпаведны сацыяльны заказ і фінансаванне, а не дзеля таго, што нам гэтага захацелася.

Дарэчы, працэсы, звязаныя з ІСДПМА, з’яўляюцца часткай агульнай рэарганізацыі універсітэта як у галіне платнай адукацыі і навукова-даследчай работы, так і вытворчай дзейнасці.

Заўважу, што ў арганізацыі платнай адукацыі на сёння няма сістэмы пры наяўнасці вялікага нявыкарыстанага рэсурсу. У цяперашні момант платныя адукацыйныя паслугі мы пераважна аказваем непасрэдна ў галіне вышэйшай адукацыі, усё астатняе яшчэ ў зародкавым стане. Перад ІСДПМА стаіць задача пашырыць спектр адукацыйных паслуг. Часткова гэтыя функцыі стаў выконваць згаданы вучэбны цэнтр. Разам з тым, больш шырокія магчымасці і стымулы ў гэтай сферы атрымае новы інстытут ва універсітэце, які мае статус юрыдычнай асобы і будзе цалкам існаваць на гаспразліку.

Што датычыць ІСДПМА, то я лічу, што цяперашнія дырэктары цэнтраў з’яўляюцца кампетэнтнымі кіраўнікамі, здольнымі рэалізаваць вялікі патэнцыял інстытута. Наступны год будзе вызначальным у яго дзейнасці, і я аптымістычна настроены наконт далейшых перспектываў.

Анастасія ЮДЧЫЦ
Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА

СВЯТКАВАННІ

45 ГАДОЎ НА СКРЫЖАВАННІ КУЛЬТУР

Факультэт дауніверсітэцкай адукацыі адзначыў 45 гадоў падрыхтоўкі замежных слухачоў. Яна пачалася ў БДУ паводле загаду Міністэрства адукацыі БССР ад 11 верасня 1961 года. Першым дэканам новай структуры стаў доктар гістарычных навук, прафесар Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка. За 45 гадоў на факультэце прайшлі курс навучання каля 7000 чалавек з 98 краінаў свету. Яго выкладчыкі працавалі таксама на падрыхтоўчых аддзяленнях універсітэтаў Алжыра, Англіі, Афганістана, Індыі, Кубы, Сірыі, Францыі, ФРГ, Чэхаславакіі, Японіі.

З ЧАГО ПАЧЫНАЛІ

Таісія Плешчанка, першая загадчыца кафедры рускай мовы, прыгадвае сваё хваляванне перад сустрэчай замежных студэнтаў. Больш за 60 кубінцаў меліся прыехаць 26 лістапада, і да таго часу трэба было наладзіць належную сістэму падрыхтоўкі. Не было спецыяльных падручнікаў, метадычных указанняў, тэхнічных сродкаў. Дзеля набыцця вопыту давялося ехаць у Кіеў.

Слухачы мусілі вучыць незнаёмую мову і "падцягваць" узровень ведаў па абранай спецыяльнасці. Выкладчыкі былі на працы з 9-й гадзіны раніцы да 11-й увечары: займаліся са сваімі навучэнцамі, уладкоўвалі іх побыт, інструктавалі беларускіх студэнтаў, якія раней з замежнымі не мелі спраў. За 7 месяцаў кубінцы падрыхтаваліся добра: усе паступілі на асноўныя факультэты БДУ.

СПЕЦЫФІКА

Інэса Ташлыкова, загадчыца кафедры рускай мовы:

"На нашым факультэце многа "ветэранаў" — тых, хто разам са мной прыйшоў у 70-х і дасюль працуе тут. Мы вельмі любім сваю работу. Да нас прыязджаюць з розных краін, кожны год з'яўляюцца новыя людзі са сваёй культурай, сваім мысленнем. Мы з імі застаемся заўсёды маладымі. Выкладчыкаў часам дасылаюць за мяжу, у краіны Афрыкі, Азіі, Лацінскай Амерыкі... Я, прыкладам, ездзіла на Кубу, дзе вельмі парадавалі адносіны да нас насельніцтва... Мы рады, што лёс даў такую цікавую працу".

СУЧАСНЫ СТАН

Распавядае дэкан Вячаслаў Малафееў:

— У гэтым навучальным годзе на факультэт быў вялікі набор, 232 замежныя слухачы. Сярод іх пераважаюць кітайцы (больш за 75 %, у мінулыя гады лічба не перавышала 50 %). Мы наладзілі добрыя адносіны з адукацыйнымі арганізацыямі Кітая пры дапамозе нашых выпускнікоў, якія працуюць у гэтых установах. У 2004—2005 годзе мы навучалі 56 нігерыйцаў, 7 з іх працягнулі вучобу ў БДУ. Калі ж казаць увогуле, то апошнія 5 гадоў да нас прыязджаюць з 20 краін.

Рупімся, каб мерапрыемствы, якія штомесяц ладзім на факультэце, аб'ядноўвалі студэнтаў з розных куткоў свету. Гэта спрыяе засваенню мовы. Экскурсіі, выпуск насценгазеты на рускай мове — таксама элементы адукацыі.

— Якія тэхналогіі выкарыстоўваюцца падчас навучання?

— Нашы выкладчыкі, людзі дасведчаныя ў выкладанні рускай мовы для іншаземцаў, падрыхтавалі вялікі аўдыёматэрыял. Ён увайшоў у комплекс вучэбна-тэставых праграм, распрацаваны сумесна са студэнтамі факультэтаў радыёфізікі і прыкладной матэматыкі. Сёлета ў маі адбылася прэзентацыя складзенай намі "Тыпавой навучальнай праграмы для замежных слухачоў падрыхтоўчых факультэтаў і аддзяленняў", сёння ёй карыстаюцца амаль усе адпаведныя ўстановы краіны. Зараз працуем над стварэннем нацыянальнага падручніка па рускай мове для замежных студэнтаў, бо пакуль што навучанне вядзецца па маскоўскім падручніку, дзе тэмы, вакол якіх згуртавана лексіка, тычацца Расіі, а не нашай краіны.

СТУДЭНТЫ ЎЧОРА...

Юсэф Бхаці прыехаў да нас з Пакістана, бо тут больш спрыяльныя ўмовы для адукацыі. Прайшоў падрыхтоўку на ФДА ў 1992 г., пасля вучыўся ў Кіеве на інжынера-электраманіка авіяцыі, у Лондане стаў спецыялістам у галіне спадарожнікавай сувязі. Працаваў у Японіі, Саудаўскай Аравіі, на радзіме... і вярнуўся да нас, бо "палюбіў Беларусь і яе вясёлых людзей". Зараз працуе ў кампаніі "BEST-GSM" кансультантам. З часоў навучання ў БДУ захаваў многа фотаздымкаў, добрыя ўспаміны і цёплыя адносіны з былымі выкладчыкамі. Сваім суайчыннікам Юсэф рэкамендуе вучыцца ў Беларусі.

...І СЁННЯ

Ван Шывэй з гораду Чан-Чунь, што на поўначы Кітая, вельмі любіць рускую мову. Вучыць яе з 14 гадоў, здольны пісаць на ёй вершы і весці дзённік. Ван Шывэй выдатна малюе алоўкамі і лёгка пераможа вас пры гульні ў пінг-понг. Хлопец мае намер працягваць адукацыю на факультэце міжнародных адносін: яго цікавіць турызм. Пасля атрымання дыплома збіраецца ўладкавацца на працу ў Беларусі. Любіць Мінск за "чысціню і вялікую колькасць сімпатычных людзей".

Урывак з верша Ван Шывэя (пераклад з рускай мовы):

Давай лётаць
І намагацца забыць,
Дзе ночы стаяць.
Глядзі, якая
чырвона-ружовая ракета!
Гэта я! Я яркая ружа!
Я гарачая любоў!
Халодны вецер і снег
Смеласці й трываласці мне надалі.
Паглядзі! Падаюць у маім сне
Мае слёзы...

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

АКЦЫІ

СТОП, СНІД!

Сусветны дзень прафілактыкі СНІДу быў адзначаны ў БДУ шэрагам акцый.

30 снежня ва універсітэцкім дворыку актывісты ГА "БРСМ" аформілі з тысячы свечак заклік "Стоп СНІД". У галоўным корпусе адначасова прайшоў конкурс-выстава плакатаў. Там жа на вялікім экране былі паказаны ролікі на тэму ВІЧ-інфекцыі, наведвальнікам раздаваліся інфармацыйныя матэрыялы наконт прафілактыкі СНІДу.

А 1 снежня ў будынку ліцэя БДУ прайшоў Міжвузаўскі фестываль "Студэнты супраць СНІДу". У яго рамках быў праведзены канцэрт на адпаведную тэматыку, адбылася выстава плакатаў, падрыхтаваная студэнтамі БДУ. У мерапрыемстве таксама прымалі ўдзел БНТУ, БДЭУ, БДМУ, БДАТУ, МДЛУ, БДУКМ, БДУФК, Акадэмія музыкі і Камандна-інжынерны інстытут пры МНС Беларусі. Арганізатарам акцыі зноў выступіў камітэт БРСМ нашага універсітэта разам з Рэспубліканскім цэнтрам гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя пры падтрымцы праграмы ААН UNAIDS.

Некаторыя тэматычныя мерапрыемствы адбыліся таксама ў студгарадку БДУ. Тут прайшлі спартландыя з удзелам студэнтаў з інтэрнатаў № 3 і № 10, акцыя "Сцеражыся: СНІД" у інтэрнаце № 6, сустрэча з доктарам-гінеколагам у інтэрнаце № 7, конкурс плакатаў "Будучыня без СНІДу".

Паводле інфармацыі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю

ЮБІЛЕІ

ТАЛЕНАВІТЫ НАВУКОЎЦА І АРГАНІЗАТАР

1 снежня адзначыў юбілей прафесар Якаў Валянцінавіч РАДЫНА.

Нарадзіўся ён у 1946 г. у в. Брылькі Валожынскага раёна. Атрымаў адукацыю ў БДУ, дзе і працуе з 1969 г. У 1972 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1975 г. загадчык навастворанай кафедры функцыянальнага аналізу. У 1987 г. абараніў доктарскую дысертацыю. У 2004 г. абраны член-карэспандэнтам НАН Беларусі.

Якаў Валянцінавіч — аўтар каля 200 навуковых работ, кніг і падручнікаў. Ён з'яўляецца рэдактарам "Руска-беларускага матэматычнага слоўніка". Дзейнасць Я.В. Радыны адзначана прэміяй Ленінскага камсамолу Беларусі ў 1978 г. і Дзяржаўнай прэміяй Беларусі ў 1996 г., шматлікімі граматамі.

Віншуем Якава Валянцінавіча! Жадаем здароўя, удачы і поспехаў у далейшай дзейнасці.

Супрацоўнікі і студэнты механіка-матэматычнага факультэта

ДАСЛЕДЧЫЦА БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ

28 лістапада адзначыла юбілей доктар эканамічных навук, прафесар кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці Людміла Васільеўна КАЗЛОЎСКАЯ.

Яна нарадзілася ў 1936 г. у в. Бабчын Хойніцкага раёна. У 1958 г. закончыла геолага-геаграфічны факультэт БДУ з дыпломам з адзнакай.

Л.В. Казлоўская — аўтар і сааўтар больш за 150 друкаваных прац, манаграфій і дапаможнікаў. Яе асноўны навуковы інтарэс тычыцца даследавання Беларускага Палесся. Яна ўдзельнічала ў адпаведных рэспубліканскіх комплексных праграмах, а таксама ў падрыхтоўцы Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на перыяд да 2020 г.

Цяпер з'яўляецца членам Прэзідыума ВАК Беларусі, навуковым кансультантам "Беларускай энцыклапедыі", уваходзіць у рэдкалегіі шматлікіх часопісаў.

За свае заслугі ў навуковай сферы і грамадскім жыцці Л.В. Казлоўская была ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Міністэрства адукацыі Беларусі, Дзяржаўнага вышэйшага атэстацыйнага камітэта Беларусі, а таксама нагрудным знакам "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь".

Віншуем Вас, Людміла Васільеўна!

Супрацоўнікі і студэнты геаграфічнага факультэта

АБ'ЯВЫ

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс
на замяшчэнне вакантнай пасады:

малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.11.07 (аптычныя і оптыка-электронныя прылады і комплексы).

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс
на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, крыніцазнаўства, фізічнага выхавання і спорту;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай фізікі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, класічнай філалогіі, славянскіх літаратур, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, аналітычнай хіміі, высокамалекулярных злучэнняў, фізічнай хіміі, грамадскага здароўя і аховы здароўя, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: культуралогіі, класічнай філалогіі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, тэорыі функцый;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскіх моў, германскіх моў.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ЦЭНТР ФІЛАЛАГІЧНЫХ ПАСЛУГ БДУ АДУКАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЯ ЎСТАНОВА "ДАСТЛУК" ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ

запрашаюць на курсы
турэцкай мовы

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па адрасе: вул. К. Маркса, 31, аўдыторыя 59, а таксама па тэлефонах 222-33-65 (БДУ), 227-01-60 ("Дастлук").

БДУ ў СМІ Беларусі

"Дзень кар'ернага росту", які адбыўся на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — "Работа не волк — в лес не убежит" (**"Минский курьер", 23.11**).

Музей гісторыі БДУ — "Yesterday and today" (**"Minsk Times", 23.11**).

Дні псіхалогіі на ФПМІ — "Вместо доктора Курпатова" (**"Знамя юности", 24.11**).

Пераможцы конкурсу БДУ "Лепшы маладзёжны праект" — "Сродкі — пад студэнцкія праекты" (**"Звязда", 24.11**); "От сайта до видеоролика" (**"Знамя юности", 01.12**).

Інтэрв'ю з дырэктарам Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Пятром Лапо — "Адлюстраванні часу і лёсу" (**"Літаратура і мастацтва", 24.11**).

Пра аздараўленне студэнтаў у санаторыях-прафілакторыях ВНУ, у тым ліку і ў БДУ, — "Здароўе студэнта — на вагу золата" (**"Звязда", 24.11**).

Узнагароджанне пераможцаў і прызёраў Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ дыпломамі спецфонду Прэзідэнта Беларусі — "Награды достойны" (**"Минский курьер", 25.11**); "Одаренные студенты — потенциальный резерв белорусской науки" (**"Народная газета", 29.11**); "Кропка ў маім даследаванні яшчэ не пастаўлена" (**"Народная газета", 30.11**); "Лауреаты-стипендиаты" (**"Знамя юности", 01.12**).

Міжнародная канферэнцыя "Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў на факультэце вышэйшай навучальнай установы" — "Эксперымент на гістарычным факультэце працягваецца" (**"Настаўніцкая газета", 28.11**).

Кірмаш вакансій у БДУ — "А вакансия директора у вас есть?" (**"Минский курьер", 28.11**); а таксама ў рубрыцы "События" (**"Советская Белоруссия", 28.11**); "Сегодня в БГУ студентам предложат работу" (**"Комсомольская правда в Белоруссии", 29.11**).

Форум студэнтаў "ІК-ПОРТ-2006" у БДУ — "Будущее — за коммуникациями" (**"Минский курьер", 29.11**); у рубрыцы "Сегодня" (**"Вечерний Минск", 29.11**).

Пра герб БДУ — "На гербе БГУ — папараць-кветка" (**"Минский курьер", 29.11**).

Дзень донара ў БДУ — "День донора в Белгосуниверситете" (**"Вечерний Минск", 30.11**).

Міжнародная канферэнцыя "Журналістыка-2006" на журфаку БДУ — "Журналисты поделятся опытом" (**"Рэспубліка", 30.11**).

Прэзентацыя кнігі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Балгарыі ў Беларусі Петка Ганчава ў БДУ — "Возрождающийся гигант" (**"Рэспубліка", 30.11**); "Все о Поднебесной" (**"Минский курьер", 30.11**).

Пра перспектывы студэнтаў, якія вывучаюць італьянскую мову, — "Дольче вита для начинающих" (**"Знамя юности", 01.12**).

Міжнародная канферэнцыя "Мова і соцыум" на філфаку БДУ — "Язык до Минска доведет" (**"Минский курьер", 01.12**).

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы, тэлеканалы, Беларускае радыё і FM-станцыі.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ

7 снежня 2006 года, № 20 (1950)

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

Па выніках трэцяга квартала ў БДУ выдадзена 169 кніг агульным абе'мам 1161,07 улікова-выдавецкіх аркушаў. Падпісана да друку і знаходзіцца ў друкарні 120 арыгіналаў-макетаў кніг і брашур вучэбнай, даведачнай і навуковай літаратуры.

Здоровый образ жизни. Выпуск 3. У зборнік увайшлі артыкулы, у якіх разглядаюцца асноўныя фактары здаровага ладу жыцця студэнцкай моладзі: рэжым харчавання, прафілактыка шкодных звычак, арганізацыя рухальнай актыўнасці, нетрадыцыйныя метады аздараўлення.

Французский язык: Тексты для чтения. У дапаможнік патрапілі аўтэнтычныя тэксты і дыялогі, якія дазваляюць пашырыць веды студэнтаў пра жыццё сучаснага французскага грамадства ў яго разнастайных аспектах: паўсядзённы побыт, культура, адукацыя, палітыка і г.д.

Криминология. Праграма вызначае выкладанне названай дысцыпліны студэнтам усіх формаў навучання.

Уголовно-исполнительное право. Праграма вызначае выкладанне названай дысцыпліны студэнтам усіх формаў навучання.

Уголовное право зарубежных государств. Навучальна-метадычны дапаможнік прызначаецца для арганізацыі практычных заняткаў і самастойнай работы студэнтаў.

Лопатин И.К. **Основы зоологической систематики.** У вучэбным дапаможніку выкладаецца гісторыя сістэматыкі ад часоў Лінэя да нашых дзён, даюцца характарыстыкі таксанаметрычных катэгорый і іх іерархія.

Теория нормированных векторных пространств. Метадычны дапаможнік змяшчае асноўныя вызначэнні і тэарэмы з раздзела "Нарміраваныя вектарныя прасторы".

Барановская С.Н., Яшкин В.И. **Высшая математика.** У практыкуме для студэнтаў нематэматычных спецыяльнасцей даюцца базавыя даведачныя матэрыялы, прыклады рашэння задач і варыянты заданняў для кантрольных і самастойных работ.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы

КОНКУРСЫ

ЛЕПШЫЯ МАЛАДЗЁЖНЫЯ ПРАЕКТЫ

У канцы лістапада былі падведзены вынікі штогадовага конкурсу "Лепшы маладзёжны праект" для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ. З 14 ініцыятыў, заяўленых на конкурс, былі выбраны 4 найлепшыя. Першае месца заняў сайт Студэнцкага саюза БДУ "Студэнцкае скрыжаванне". На другім месцы — задума арганізацыі міжвузаўскага фестывалю студэнцкіх відэаролікаў "Кінаграні". Трэцяе месца атрымала канцэпцыя развіцця трэнінгавага цэнтра псіхалагічнай службы БДУ. Завяршае спіс пераможцаў праект студэнтаў гуманітарнага факультэта "Падзяліся цеплынёй сваёй душы". Пра вынікі конкурсу і асаблівасці яго правядзення расказаў намеснік начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Аляксей Багамазаў:

— Вопыт правядзення конкурса паказвае, што такая праграма патрэбна як студэнцтву, так і кіраўніцтву універсітэта. Напрыклад, калі ў 2003 г. у ёй прынялі ўдзел толькі 8 калектываў, то ў 2006-м — ужо 14. Як бачыце, з кожным годам цікавасць да "Лепшага маладзёжнага праекта" расце. А гэта сведчыць аб развіцці творчай ініцыятывы. Трэба заўважыць, што грашовыя сродкі, якія выдзяляюцца дзяржавай на рэалізацыю студэнцкіх праектаў, таксама павялічваюцца. На гэты раз будзе выдаткавана 5 мільёнаў рублёў.

— Конкурс ладзіцца з 2003 г. Якія задумы за гэты час былі паспяхова ўвасоблены ў жыццё?

— Можна ўзгадаць шмат паспяховых праектаў. Сярод іх праект БРСМ БДУ "Студэнцкі цэнтр занятасці", праект студгарадка "Студэнцкая студыя SVS", праект калектыву Інстытута тэалогіі БДУ "Тэатр-студыя "Божая кароўка", праект псіхалагічнай службы нашага універсітэта "Студэнцкі псіхалагічны клуб БДУ" і многія іншыя. Такім чынам, нягледзячы на тое, што конкурс дастаткова малады, ён дапамог рэалізаваць многія цікавыя ідэі нашай таленавітай моладзі.

— Паводле якіх крытэрыяў экспертная камісія сёлета адзначала праграмы?

— У склад журы ўваходзілі 8 чалавек на чале з прарэктарам Уладзімірам Васільевічам Суворавым, якія ацэньвалі кожную праграму па канкрэтных пунктах. Самымі важнымі сярод іх былі мэты праекта, яго актуальнасць, магчымасць атрымаць добрыя вынікі.

— Адкуль найбольш актыўна паступалі заяўкі на конкурс?

— Ажно 4 праекты былі пададзены ад Студэнцкага саюза. Гэта арганізацыя кожны год вызначаецца найбольшай ініцыятыўнасцю. Заўжды актыўна ўдзельнічаюць у конкурсе студгарадок і ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю. Таксама мы разглядалі праекты з Інстытута тэалогіі, юрыдычнага факультэта, факультэта філасофіі і сацыяльных навук, гуманітарнага факультэта, псіхалагічнай службы універсітэта.

— Раскажыце пра сутнасць кожнага з праектаў-пераможцаў.

— Мэта праекта Студэнцкага саюза БДУ не проста распрацаваць сайт, а стварыць электронна-інфармацыйную прастору маладзёжных арганізацый БДУ — "Студэнцкае скрыжаванне". Распрацоўшчыкі праекта плануюць размясціць на сайце юрыдычную інфармацыю, навіны студэнцкага цэнтра занятасці, праводзіць штомесяц on-line-канферэнцыі.

Праект фестывалю студэнцкіх відэаролікаў "Кінаграні" цікавы тым, што такая форма работы з моладдзю, якую прапануе студэнцкі гарадок, у нашай краіне яшчэ ніколі не выкарыстоўвалася. Конкурс маладзёжных фільмаў, майстар-класы спецыялістаў у галіне кінематаграфіі і тэлебачання, сустрэчы з дзеячамі кіно, крытыкамі — аснова праекта.

Псіхалагічная служба БДУ распрацавала канцэпцыю трэнінгавага цэнтра, у якім будзе ажыццяўляцца сацыяльна-псіхалагічная работа са студэнтамі. А сутнасць праграмы "Падзяліся цеплынёй сваёй душы" гуманітарнага факультэта заключаецца ў дабрачыннай рабоце ў рэабілітацыйных цэнтрах, дзіцячых дамах і прытулках.

— Як хутка праграмы, што зараз існуюць ў выглядзе пісьмовых напрацовак, пачнуць рэалізоўвацца?

— Актыўная работа ўжо вядзецца. Неабходныя фінансавыя сродкі будуць выдзелены адразу пасля таго, як распрацоўшчыкі праектаў-пераможцаў афармяць належныя дакументы. Увогуле, праект Псіхалагічнай службы ўжо рэалізуецца: штомесяц набіраюцца групы студэнтаў, якія праходзяць адпаведную падрыхтоўку. Зладзіў сваю першую акцыю і гуманітарны факультэт. Канчатковае завяршэнне праграмнай часткі сайта Студэнцкага саюза і яго запуск плануюцца напрыканцы студзеня наступнага года. Фестываль студэнцкіх відэафільмаў "Кінаграні" адбудзецца ў красавіку 2007 г.

Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК

НЕ ПРАМІНІЦЕ

ВЫДАННЕ "САФІІ"

На пачатку кастрычніка Саюз жанчын БДУ выпусціў альманах пад назвай "Сафія". Тэматычная падборка матэрыялаў вельмі разнастайная. Чытачы знойдуць на старонках выдання артыкулы, прысвечаныя ахове здароўя дзяцей, гендэрным пытанням, Чарнобыльскай трагедыі, а таксама рэтраспектыўныя звароты да беларускай мінуўшчыны, інтэрв'ю з цікавымі людзьмі (напрыклад, гутарка з дачкой Івана Шамякіна). Змяшчае альманах і вершы.

Аўтарамі праекта выступілі С.Р. Савіна, М.М. Урбан. Рэдактар — Вольга Бардзіян.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

У ВОЛЬНЫ ЧАС

ПРЫГАЖОСЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ

Напрыканцы лістапада былі падведзены вынікі адмысловага конкурсу "Міс Інтэрнэт — 2006". Як заўсёды, прадстаўніцы БДУ трымалі марку. Доказам гэтага стала тое, што сярод пераможцаў былі дзве прыгажуні з нашага універсітэта.

"Першай віцэ-міс" стала студэнтка-чацвёртакурсніца факультэта журналістыкі Юлія Папова, якая, дарэчы, некалькі гадоў супрацоўнічала з "Універсітэтам".

— Як праходзіў конкурс?

— Усяго былі два туры. Першы — завочны: у ім маглі ўдзельнічаць усе жадаючыя. Па выніках галасавання былі адабраны 10 фіналістак, якія ўжо і змагаліся за першыя месцы ў клубе "Сфера" перад журы. У фінале канкурсантак чакалі чатыры выпрабаванні: тры дэфіле (у звычайнай вопратцы, купальніку, вячэрнім убранні) і творчы конкурс. Я паставіла гумарыстычны танец: адначасова была балерынай і мячыкам для гульні ў тэніс. Ніякіх грымёраў ці стылістаў не было, самі рыхтаваліся, дапамагалі адна адной. Шчыра кажучы, у нас нават рэпетыцый не было. А ў падарунак я атрымала незразумелую рэч (пазней выявілася, што гэта была ванначка для педыкюру), дзве цацкі і касметыку.

А зараз звернемся да сапраўднай рэкардсменкі па колькасці ўзнагарод. Студэнтка II курса гуманітарнага факультэта Кацярына Войтус перамагла ў трох намінацыях! Яна атрымала званні "Міс фітнэс", "Міс Мальвіна", а таксама прыз сімпатый гледачоў.

— Калі я выступала з арабскім танцам, мяне падтрымлівалі больш, чым астатніх удзельніц, асабліва маё выступленне спадабалася члену журы спявачцы Уладзе. Мне пашанцавала: я выступала пад сваім шчаслівым нумарам "сем", што і дапамагло. Была вельмі смешная сітуацыя, калі я напалохала фатографа за сцэнай. Я крычала на аднаго бессаромніка, які падглядаў за мной у грымёрцы, а бедны фатограф падумаў, што гэта я на яго злуюся... Усё было добра і па-святочнаму, але былі і недарэчнасці. Напрыклад, пераможцы нават не падарылі кветак, калі ўзнагароджвалі. Але пазітыву было болей.

За тры гады правядзення конкурс "Міс Інтэрнэт" стаў вельмі папулярным, бо ў ім можа прыняць удзел кожная дзяўчына.

Лейла ІСМАІЛАВА

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

Міжнародная штогадовая навукова-практычная канферэнцыя "Журналістыка—2006" адбылася 1 снежня на факультэце журналістыкі. Удзел у мерапрыемстве прынялі 120 чалавек, якія прадстаўлялі Міністэрства інфармацыі Беларусі, рэдакцыі найбуйнейшых перыядычных выданняў, радыё і тэлебачання, службаў па сувязях з грамадскасцю, інфармацыйных агенцтваў. Навучальныя ўстановы былі прадстаўлены Белдзяржуніверсітэтам, Гродзенскім і Віцебскім універсітэтам, а таксама Інстытутам парламентарызму. Былі запрошаны таксама госці з Казахстана, Кітая, Літвы, Расіі, Украіны.

Дыскусіі вяліся па 10 секцыях і круглых сталах, на якіх абмяркоўваліся такія тэмы, як "Тэндэнцыі развіцця сучасных СМІ", "СМІ і праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці", "Нацыянальная прэса ў сістэме СМІ", "Аўдыёвізуальныя СМІ" і інш.

АДЗНАЧАЕМ ДЗЕНЬ ЮРЫСТА

Да Дня юрыста, што адзначаецца 3 снежня, на юрыдычным факультэце падрыхтавана вельмі шырокая праграма.

2 снежня ў рамках святочных мерапрыемстваў адбылася сустрэча выпускнікоў факультэта. На наступны дзень "Саюз юрыстаў Беларусі" падвёў вынікі агульнабеларускага конкурсу па вызначэнні "найлепшага юрыста-навукоўца". Гэтае пачэснае званне атрымаў доктар юрыдычных навук прафесар кафедры грамадзянскага і сямейнага права юрыдычнага факультэта БДУ Васіль Фёдаравіч Чыгір.

Сёння кафедра канстытуцыйнага права праводзіць канферэнцыю на тэму "Усеагульная Дэкларацыя правоў чалавека". А 11 снежня адбудзецца круглы стол на гэтую ж тэму, арганізаваны студэнцкім навуковым саветам. Акрамя таго, да 12 снежня на ўсіх кафедрах будуць працягвацца пасяджэнні тэматычных навуковых гурткоў па розных галінах права. А ў факультэцкай бібліятэцы можна пазнаёміцца з выставамі "Юрыдычны факультэт на старонках прафесійных перыядычных выданняў" (чытальная зала перыядычнага друку і замежных выданняў) і "Выстава матэрыялаў канферэнцый па юрыспрудэнцыі з фондаў факультэта" (у чытальнай зале № 1).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВІНШУЕМ!

МАЛАЙЧЫНА, "КАЛЕГА"!

Да Міжнароднага дня студэнтаў быў прымеркаваны фінальны тур гарадскога конкурсу дзіцячых і юнацкіх СМІ "Зменім свет да лепшага!".

Другое месца на ім заняла газета юрыдычнага каледжа БДУ "Калега". Рэдакцыя газеты (Дзмітрый Жылеўскі, Марыя Шыдлоўская, Настасся Лойка) атрымала таксама спецыяльны дыплом і памятны прыз Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

Удзел у мерапрыемстве прымалі калектывы газет, якія прадстаўлялі не толькі сталічныя школы, гімназіі, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, але і разнастайныя рэгіёны краіны (Рагачоў, Пінск, Маладзечна і г.д.). Ініцыятарамі конкурсу выступілі Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі разам з газетай для дзяцей і падлеткаў "Переходный возраст".

Паводле інфармацыі юрыдычнага каледжу

З УСМЕШКАЙ

***

Студэнт на экзамене выходзіць адказваць з маленькім кавалачкам паперы.

— А дзе Ваш адказ? — пытаецца выкладчык.

— У галаве.

— А гэта што такое?

— А гэта не змясцілася!

***

Студэнт не ведае прадмет у двух вышадках: альбо яшчэ не здаваў, альбо ўжо здаў.

***

— Прафесар, а два балы за што?

— Адзін бал — за тое, што з'явіліся на іспыт. Другі — за спробу адказваць.

— А трэці не можаце накінуць за тое, што я сыду?

***

Памятай: не такі страшны прафесар, як ён чытае.

***

Парта — крыніца ведаў. Канспект — іх магіла.

УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

7 снежня 2006 года
Падпісана да друку 6.12.2006 г.
Зак. 1114. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by